# Заданне 3 «Арнамент»

**Для аздаблення сукенкі лялькі быў абраны арнамент з выявай стылізаванага васілька. З даўніх часоў васілёк з'яўляецца сімвалам Беларусі. Выявы гэтай кветкі прысутнічаюць у беларускім арнаменце, апеты ў вершах.**



**Стаіць,**
**Паглядае з пагорка,**
**Як зорка**
**Аднекуль здалёк,**
**Часцінка**
**Любімай старонкі,**
**Часцінка зямлі –**
**Васілёк.**

Майстры-рамеснікі выкарыстоўвалі вобраз васілька ў сваіх рамёслах. Лічылася, што васілёк валодае магічнай сілай і можа абараняць ад злых духаў.

Мы часта называем Беларусь сінявокай, але не толькі за вялікую колькасць азёр на яе тэрыторыі, але і за сінюю кветачку, якая сустракаецца ў жыце і нагадвае сінія вочкі.